**Тэма: Знакі прыпынку ў сказах з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах**

***Мэты:***

*даць паняцце пра будову сказаў з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах;*
*выпрацоўваць уменне выяўляць у сказах аднародныя члены сказа з абагульняльнымі словамі, ставіць двукроп'е або працяжнік у адпаведных выпадках, карыстацца сказамі з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах у вусным і пісьмовым маўленні;*
*выхоўваць любоў да роднага краю, да прыроды.*

**Тып:** урок новых ведаў

**Абсталяванне:** падручнік, мультымедыйная прэзентацыя, карткі

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой**

***Весела гучыць званок,***
***Яго голас нам знаёмы,***
***Запрашаем на ўрок***
***Беларускай мовы!***

Добры дзень дзеці, рада вас бачыць, сядайце. Няхай сённяшні дзень для вас будзе спрыяльным, а ўрок будзе для вас удалым і плённым. Аднойчы чалавек спытаў у мудраца: які дзень тыдня самы лепшы, каб пачаць новае жыццё, каб стаць паспяховым, шчаслівым. Можа, гэта серада?

Мудрэц падумаў і адказаў … Як вы думаеце, які дзень тыдня назваў мудрэц?..

Мудрэц падумаў і сказаў:

Гэты дзень тыдня называецца ***сёння***.

Вы згодны з мудрацом? А якую прыказку вы ведаеце, што звязана са словам ***сёння*** і нашымі справамі?

***Не адкладвай на заўтра тое, што можна зрабіць сёння***.

Вось і мы з вамі сёння паспрабуем выканаць усё тое, што запланавалі. Пачнём мы з вамі з паўтарэння вывучанага на мінулым ўроку

**ІІ. Паўтарэнне пройдзенага матэрыяла.** *(Адказы на пытанні)*

1. Аднароднымі з'яўляюцца тыя члены сказа, якія…
2. Аднароднымі членамі сказа могуць быць…
3. Аднародныя члены сказа злучаюцца…
4. Паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска…
5. Коска не будзе ставіцца паміж аднароднымі членамі …

**ІІІ. Практычная частка.**

1. **Праблемная сітуацыя**.

На партах вучні знаходзяць надрукаваныя словы. Са слоў трэба скласці сказ.

***Усё мільгала за вокнамі цягніка: шматпавярховыя будынкі, хаты, палі, пералескі.***

Чаго не хапае ў сказе? Так, знака прыпынку – двукроп’е. Сфармулюйце, калі ласка, тэму і мэту нашага ўрока.
Малайцы! А зараз мы распачнём працу па тэме “Знакі прыпынку ў сказах з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах”.
А зараз разгарніце сшыткі, запішыце дату, класная работа і тэму нашага ўрока

Замацуем веды, папрацуем з практ.185 (с.113).

(тры вучні працуюць каля дошкі са сказамі – 1,2,3), пасля яшчэ 6 сказ.

А зараз крочым далей і звернемся да практ.186 (вусна).

Дык што мы будзем называць абагульняльным словам?

Знайдзіце адпаведнае тлумачэнне ў падручніку (с.114).

Практ.187 (вусна), прачытаем тэксты, вызначым, ці ёсць тут абагульняльныя словы.

Абапіраючы на дадзеныя прыклады, паспрабуем сказаць, калі і які знак прыпынку ставіцца ў сказах з аднароднымі членамі пры абагульненых словах. (*Адказы вучняў*).

**IV. Фізкультхвілінка.**

1. Практ.188, чытаем тэкст. Тлумачым пастаноўку знакаў прыпынку. Сказы з абагульняльнымі слова запішам на дошцы, пабудуем схемы.
2. Праца з тэкстам.

*Дапоўніце апавяданне, выкарыстоўваючы падыходзячыя па сэнсу словы.*

Мой дзень пачынаецца рана. У сем гадзін раніцы я О, О, О і О. Раніцай звычайна іду пешшу, гэта вельмі асвяжае. У восем гадзін пачынаюцца заняткі. Урокі О, О, О, О праходзяць хутка. Пасля ўрокаў О і О ідзём на лыжах у лес. Вакол усё пакрыта снегам: і О, і О, і О.
Мы вяртаемся дадому адпачыўшымі, а потым рыхтуем ўрокі. Увечары я або О, або О.

**V. Замацуем набытыя веды на ўроку невялікай тэставай работай.**

1. **У якім сказе правільна расстаўлены знакі прыпынку?**
1) Поле злёгку хвалюецца і пераліваецца то светла-зялёнымі, то цёмна-сінімі фарбамі.
2) Смуга ахінае далёкія вёскі і ўзгоркі і палі, і пралескі.
2. **У якім сказе ёсць абагульняльнае слова?**
1) У лесе выразна адрозніваюцца галасы берасцянак, лясных жаўрукоў, сініц, драздоў.
2) Тут аб’ядналіся разам усе выгоды: і лес, і луг, і шырокая рака, і зараснік.
3. **У якім сказе знакі прыпынку расстаўлены правільна?**
1) Зелена было ўсюды – у полі, на гародах і балотах. (І. Мележ)
2) 3. І лес, і поле, і луг, і гай – усё маўчала. (Якуб Колас)
4. **Які сказ адпавядае дадзенай схеме:** О: О, О і О

1) Зямля, дрэвы, стрэхі – усё было пакрыта ледзяной коркай.
2) Сонца загляне ўсюды: у лес, на поле і луг.

**Адказы: 1-2; 2 -2; 3 -2; 4 -2.**

**VI. Падвядзенне вынікаў. Адзнакі.**

**VII. Рэфлексія.**

**VIII. Дамашняе заданне**: §27, практ. 189.